# СА СВЯТАМ, ДАРАГІЯ СЯБРЫ!

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 16 (773) ● Аўторак, 28 красавіка 1970 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXIII




## У СПРАВЕ КОЖНАЙ ЛЕНІН З НАМІ

У самай вялікай зале Мінска — Палацы спорту сабраліся студэнты, выкладчыкі, супрацоўнікі універсітэта. Па-святочнаму упрыгожана сцэна. Яе абрамляюць чырвоныя палотнішчы з барэльефам Уладзіміра Ільіча Леніна. Залаціста зіхаціць лозунг «Няхай жыве ленінізм».

Гучаць гімны Саюза ССР і Беларусі. Урачысты сход, прысвечаны 100-годдзю з дня нараджэння У. І. Леніна, адкрывае рэктар універсітэта акадэмік А. Н. Сеўчанка. Месцы у прэзідыуме займаюць вядучыя вучоныя, студэнты, госці.

Слова для даклада прадастаўляецца сакратару парткома БДУ М. К. Гарбачову. Ён расказвае аб гісторыі утварэння універсітэта, што цесна звязана з імем Уладзіміра Ільіча Леніна, аб справах, дасягненнях калектыву вядучай вну рэспублікі.

На трыбуне сакратар абласнога камітэта КПБ А. Б. Насілоўскі.

— За вялікія поспехі у галіне развіцця навукі і выхавання высонакваліфікаваных кадраў Беларускі Дзяржаўны універсітэт імя Уладзіміра Ільіча Леніна узнагароджан Ганаровай юбілейнай граматай ЦК КПСС, Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС.

Усе устаюць. Пад бурныя, доўга не змаўкаючыя авацыі А. Б. Насілоўскі уручае Грамату рэктару універсітэта, акадэміку АН БССР Антону Ніліфаравічу Сеўчанку.

Горача віншуе з высокай узнагародай выкладчыкаў, супрацоўнікаў універсітэта, студэнтаў намеснік міністра вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. І. Красоўскі.

У адказ словы шчырай падзякі выказалі акадэмік А. Н. Сеўчанка, доктар філасофскіх навук, прафесар У. М. Сікорскі, студэнтка IV курса гістарычнага факультэта Людміла Грышчанка.

Затым на трыбуну выходзіць рэктар Іенскага універсітэта ГДР, прафесар Больк. Ён гаворыць пра даўнюю дружбу Беларускага і Іенскага універсітэтаў, віншуе прысутных з узнагародай і просіць прыняць падарунак, выкананы адным з лепшых мастакоў ГДР, — барэльеф Ільіча.

Паступае прапанова паслаць віншавальную тэлеграму ЦК КПСС, Прэзідыуму Вярхоўнага Савета СССР, Савету Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК КПБ. Зачытваецца тэкст тэлеграмы, які адабраецца з вялікім натхненнем.

Пасля заканчэння урачыстай часткі з вялікім канцэртам выступілі студэнты універсітэта. Больш дзвюх гадзін салісты, дэкламатары, танцоры дэманстравалі сваё майстэрства. Вельмі спадабаліся прысутным песні у выкананні хору студэнтаў з В'етнама, нумары народнага танцавальнага ансамбля «Крыжачок», верш У. Маякоўскага аб Леніне ў выкананні Юрыя Шынкара. А калі ў заключэнне народная харавая капэла у суправаджэнні народнага аркестра народных інструментаў заспявала песню аб Леніне, уся шматтысячная зала падхапіла яе словы:

Мы за партией идем,
Славим Ленина
делами,
И на всем пути
большом
В каждом деле Ленин
с нами...

***Юнакі і дзяўчаты! Настойліва авалодвайце марксісцка-ленінскай тэорыяй, вышынямі навукі і тэхнікі. Будзьце вернымі ленінскім запаветам, актыўнымі будаўнікамі камунізма!*** (З ЗАКЛІКАЎ ЦК КПСС ДА 1 МАЯ 1970 ГОДА).






НА ЗДЫМКАХ: сакратар абласнога камітэта КПБ А. Б. Насілоўскі ўручае Ленінскую юбілейную Ганаровую грамату рэктару універсітэта, акадэміку А. Н. Сеўчанку; ідзе урачысты сход.

Фота Д. ПРЭСА.

# СЁННЯ І Ў БУДУЧЫМ



Для чалавека, які упершыню трапіу ва універсітэцкі вылічальны цэнтр, многае пакажацца незвычайным і нават загадкавым, хоць у разуменні матэматыкау і фізікау усё тут так, як і павінна быць у любой установе такога роду, забяспечанай сучаснай тэхнікай. Электронная машына «Мінск-2»? Ну і што. Гэта амаль учарашні дзень, бо універсітэцкая «Мінск-2» ужо мадэрнізавана тут жа у вылічальным цэнтры і дапускае зварот да яе з любога месца тэрыторыі БДУ.

Цяпер кафедра электронных матэматычных машын сумесна з калектывам ВЦ распрацоувае мнагапультавую сістэму. Першыя вынасныя пульты ужо устаноўлены на чацвёртым паверсе галоунага корпуса у класе праграміраванага навучання. А усяго іх будзе некалькі дзесяткау. Студэнты і вучоныя атрымаюць больш шырокія магчымасці для рашэння разнастайных задач.

Многа творчасці і працы уклалі у гэту работу галоуны інжынер ВЦ Яуген Васільевіч Канавалау і галоуны інжынер кафедры ЭММ Аляксандр Іосіфавіч Тарнопальскі. Цяпер распрацоуваецца матэматычнае забеспячэнне мнагапультавай сістэмы, складаюцца праграмы для класа праграміраванага навучання. Плённыя намаганні тут супрацоунікау В. В. Бірукова, В. І. Адамовіча, Л. У. Калацкай.

Нядауна якраз з гэтым напрамкам дзейнасці ВЦ знаёміліся прадстаунікі раду вну з тым, каб пасля укараніць гэты цікавы вопыт у сябе.

Але не толькі справамі вучэбнымі занят калектыу вылічальнага цэнтра. Тут вядзецца сур'ёзная навукова-даследчая работа, ствараюцца вопытныя узоры арыгінальных прыборау і наладжванняу для патрэб вытворчасці.

— Група нашых праграмістау актыуна удзельнічала у стварэнні матэматычнага забеспячэння для машын, выпускаемых заводам імя Арджанікідзе, — расказвае начальнік ВЦ дацэнт А. М. Аранскі. — Сумесна з работнікамі АН БССР і завода падрыхтавана некалькі зборнікау навуковых работ.

Распрацавана таксама праграма для машыннага планавання вытворчых працэсау на запарожскім заводзе «Камунар», які выпускае малалітражныя аутамабілі. Работа гэта укаранёна.

Вынікам шматгадовага супрацоуніцтва з СКБ аутаматычных ліній з'явілася сістэма аутаматызаванага праектавання шпіндэльных каробак. Работа гэта экспанавалася на Лейпцыгскім кірмашы і удастоена залатога медаля і дыплома выстаукі.

Група фізікау ВЦ у апошні час паспяхова займалася укараненнем сродкау вылічальнай тэхнікі у народную гаспадарку. У г. Горкім, напрыклад, на заводзе «Рухавік рэвалюцыі» знайшлі прымяненне дзве канструкцыі, якія забяспечваюць вялікую эканомію вытворчага часу. На базе гэтых работ супрацоунікі ВЦ Г. І. Шпакоускі і М. А. Каратаеу падрыхтавалі дысертацыі.

Высокую ацэнку атрымау аутамат для прамервання тканей, створаны па заказу Калінінскага камвольнага камбіната пад кіраунііцтвам І. А. Лукашыка.

Тут жа, у вылічальным цэнтры, распрацаван аутамат для пераутварэння графічнай інфармацыі у лічбавую, які рэзка павысіу эфектыунасць сродкау вылічальнай тэхнікі. Па гэтай тэме таксама абаронена дысертацыя начальнікам аддзела эксплуатацыі Г. К. Афанасьевым.

Другі год група інжынерау і матэматыкау-праграмістау упершыню у СССР рашае задачу стварэння электроннай АТС і кіруючай машыны для электронных аутаматычных тэлефонных станцый (навуковы кіраўнік Я. В. Канавалау). Першы этап паспяхова завершан, аванпраект здадзен заказчыку. Закончыцца гэта работа прыгатаваннем вопытнага узору і складаннем задання на распрацоуку серыйнай машыны.

Нельга не сказаць хоць бы коратка і яшчэ аб адной надзвычай працаёмкай і арыгінальнай рабоце — уводзе у строй машыны «Мінск-23», якая была па сутнасці занава змацціравана на аснове заводскай дакументацыі. Гэта машына прызначаецца для эканамічных разлікау, яе можна будзе выкарыстаць для рашэння задач сацыялагічнага характару.

З адкрыццём ва універсітэце факультэта прыкладной матэматыкі яшчэ больш павялічваецца аб'ём вучэбнай работы.

У перадмайскія дні на вылічальным цэнтры, як і ва усіх універсітэцкіх службах, шмат клопатау — ад навуковых да чыста вытворчых.

А. АЛЕНІЧ.

На здымку: галоуны інжынер В. В. Бірукоу, інжынер Л. У. Калацкая (на пярэднім плане за пультам кіравання «Мінск-2»), галоуны інжынер А. І. Тарнопальскі і кандыдат навук Г. К. Афанасьеу за наладжваннем мнагапультавай вылічальнай сістэмы.

Фота Д. Чаховіча.

# ЮБІЛЕЙНАЯ АДЗНАКА

Па дарозе у Палац культуры трактаразаводцау старшыня праулення клуба БДУ Васіль Літвінка не то жартуючы, не то сур'ёзна кінуу у бок кірауніка аркестра:

— Міхаіл Аркадзьевіч, дарэмна мы вязем прыз, усё роуна ён будзе наш.

— Наш! Наш! — амаль у адзін голас падтрымалі студэнты.

— Хваліцца яшчэ рана. Канкурэнты сур'ёзныя, — адказау Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын.

Пакуль члены рэспубліканскага і гарадскога журы юбілейнага конкурсу народных аркестраў займалі свае месцы, на сцэне ішлі апошнія прыгатаванні. Адну за другой бярэ у рукі Міхаіл Аркадзьевіч домры, балалайкі. «Ля, ля»— і у адказ гучыць баян, звініць струна балалайкі, быццам перасыпаюць шкельцы, гуслі, цымбалы. Здаецца, ніякая сіла не збярэ гэтыя разнастайныя гукі у адзін матыу. Але вось лёгкі узмах рукі дырыжора — і зала напауняецца шырокай, раздольнай «З-за вострава на стрэжань», якую змяняе хуткая, задорная «Уздоўж ды па рэчаньцы». Гэта аркестр выканаў фантазію на дзве рускія народныя песні. Члены журы ставяць добрыя адзнакі, а у гэты час зала зноу напаўняецца цудоўнай танцавальнай мелодыяй, у якую, быццам арнаментам, упляліся матывы беларускай калыханкі.

Не адразу ўдалося шматлікаму калектыву студэнцкага аркестра так па-мастацку выконваць разнастайную праграму. Творчы росквіт яго звязан з гісторыяй, з біяграфіяй кожнага удзельніка аркестра.

Усё пачалося адразу пасля вайны. Студэнт філалагічнага факультэта універсітэта М. Корсак арганізавау невялікую групу аматарау народных інструментау. Пазней, калі кірауніком аркестра стау Міхаіл Аркадзьевіч Лісіцын, калектыу пачау выступаць ужо не толькі на сцэнах Беларусі, але і далёка за яе межамі.

У пяцідзесятыя гады аркестр пастаянна удзельнічаў ва усіх аглядах, фестывалях, дэкадах самадзейнага мастацтва. Ужо у 1957 годзе на Беларускім фестывалі моладзі і студэнтау калектыу аркестра узнагародзілі дыпломам І ступені. Гэта быу першы крок да сапраўднага майстэрства.

Дыпломы атрымлівалі удзельнікі аркестра і на другой дэкадзе беларускага самадзейнага мастацтва, і на усесаюзным фестывалі, прысвечаным 50-годдзю Савецкай улады. А у 1965 годзе аркестру было прысвоена званне народнага.

З гэтага часу калектыў ужо выступау з самастойнай праграмай у Маскве, Ленінградзе, Кіеве, Адэсе, Калінінградзе і іншых гарадах. Ганарацца студэнты, што у іх канцэртах прымалі удзел салісты тэатра оперы і балета, радыё, тэлебачання — народная артыстка СССР Т. Ніжнікава, заслужаныя артысты рэспублікі А. Саучанка, С. Данілюк, Л. Златава, Ю. Смірноу.

Ёсць у аркестра і свае салісты. Гэта студэнты Ларыса Чапурко, Яуген Басау, Анатоль Злобіч, Людміла Лагерная, Барыс Іваноу, супрацоунік універсітэта Яуген Сафонау.

Вось на сцэне студэнт чацвёртага курса гістарычнага факультэта Анатоль Злобіч. У суправаджэнні аркестра ён выконвае рускія народныя песні «Калінку» і «Хутарок». Анатоль ужо чатыры гады выступае з аркестрам. Ён дыпламант конкурсу салістаў вну краіны.

Шырока, перадаючы запаветнае пачуццё, Яуген Сафонаў спявае «Расію». З поспехам выконвае на дудцы варыяцыі на беларускія тэмы Святлана Татур. Каштоуны падарунак атрымау за тонкае, ажурнае выкананне «Салауя» Аляб'ева баяніст Барыс Іваноў.

Высокае выканаўчае майстэрства студэнцкага аркестра з'яўляецца вынікам шматгадовай працы на рэпетыцыях, настойлівасці і умення яго кіраўніка М. А. Лісіцына. Не так проста працаваць з такім калектывам. Амаль кожны год мяняецца чвэрць яго асноўнага саставу. Але музычнае майстэрства расце, яшчэ з большай сілай захапляе слухачоў. Нездарма, падводзячы вынікі агляду, старшыня рэспубліканскага журы Іосіф Іосіфавіч Жыновіч адзначыу, што сёлета рост аркестра вельмі значны, асабліва наглядна выдзяляецца разнастайнасць рэпертуару.

— У нашага кірауніка Міхаіла Аркадзьевіча ёсць нейкая свая струна, якой ён прываблівае чалавека. Толькі адзін раз варта пабыць на рэпетыцыях, як, лічы, што ужо на увесь час вучобы ва універсітэце застанешся з аркестрам,—гавораць студэнтка біяфака Ліда Аншакова.

Трэба дабавіць, што не толькі для Ліды аркестр стау родным і блізкім. Дауно ужо закончыу універсітэт Уладзімір Стукач. Працуе зараз інжынерам на адным з заводау Мінска, але па-ранейшаму ходзіць на рэпетыцыі. Два гады таму назад прывёу ён сюды і малодшага брата, васьмікласніка Сашу, які зараз добра іграе на кантрабасе.

Не забываюць свой аркестр і аспірант Ю. Шчарбак, намеснік дэкана філалагічнага факультэта М. Піпчанка.

Часам чуе Міхаіл Аркадзьевіч папрокі у свой адрас ад бацькоу маладых аматарау народных інструментау. «Нашы дзеці ужо, мабыць, не фізікі, не матэматыкі, а музыканты»,—гавораць яны. Але не згаджаецца з імі кіраунік, бо факты гавораць іншае: амаль кожны чацвёрты член аркестра — выдатнік вучобы. Юра Шынкар атрымлівае стыпендыю імя Карла Маркса, а студэнтка біялагічнага факультэта Наташа Калеснікава — ленінскі стыпендыят.

Журы юбілейнага конкурсу-агляду народных аркестрау прысудзіла другі раз пераходны вымпел «Лепшаму народнаму аркестру БССР» студэнцкаму калектыву універсітэта. Члены аркестра атрымалі дыпломы І ступені. Гэта высокая юбілейная адзнака студэнтам за развіццё народнага мастацтва.

М. ДРОЗД.

*На здымку: спявае Я. Сафонау. Фота М. Нечыпарэнкі.*



## *СПОРТ*

### НА БЛАКІТНЫХ СЦЕЖКАХ

*У спаборніцтвах універсітэта па плаванню, якія праходзілі у адным з лепшых басейнау краіны, прынялі удзел прадстаунікі сямі факультэтау. Сярод жанчын пераможцамі у розных відах плавання аказаліся Р. Кабярнюк (фізфак), В. Каўрыга, Міхайлава (біяфак), сярод мужчын—В. Сямёнаў, П. Мінец (хімфак), С. Іучык (журфак), Н. Рачкевіч (фізфак).*

*Эстафету 4×100 вольным стылем сярод мужчынскіх каманд выйгралі студэнты фізфака.*

*Камандныя месцы размеркаваліся наступным чынам: I — фізфак, II — хімфак, III — журфак, IV — філфак, V — біяфак, VI — юрфак, VII— геафак. Асабліва хочацца адзначыць каманду-пераможцу фізічнага факультэта, у якой лепшым чынам спалучаецца вопыт ветэранаў і задор маладых плыўцоў.*

*В. СОБАЛЕВА.*

### У ПРЫЗЁРАХ

**На закончыўшымся першынстве рэспублікі па мастацкай гімнастыцы каманда універсітэта заняла трэцяе месца, набраўшы 66 ачкоў.**

**У асабістым заліку выпускніца універсітэта майстар спорту Таццяна Філімонава заняла другое месца, прайграўшы студэнтцы першага курса педагагічнага інстытута імя А. М. Горкага Ані Ваучэцкай, якая і стала чэмпіёнкай.**

### ПАПУЛЯРНАСЦЬ РАСЦЕ

У рэспубліканскім Доме фізкультуры прайшло асабіста-каманднае першынство універсітэта па цяжкай атлетыцы. Сіламі мераліся 7 факультэтау. Спаборніцтвы былі арганізаваны добра, і у гэтым вялікая заслуга студэнтау фізічнага і юрыдычнага факультэтау, якія прынялі актыуны удзел у судзействе.

У выніку упартай барацьбы першае месца заняу фізічны факультэт, другое—гістарычны, трэцяе—матэматычны. Слабейшымі былі юрысты і хімікі.

На спаборніцтвах было паказана нямала добрых вынікау і асобнымі спартсменамі. З поспехам выступілі студэнт фізфака В. Сасункевіч і аспірант кафедры педагогікі і псіхалогіі М. Яноускі. Яны паказалі нормы, блізкія да нормау кандыдатау у майстры спорту.

Папулярнасць цяжкай атлетыкі расце з году у год. Узяць хоць бы такі факт. У мінулым годзе выступалі каманды толькі 5 факультэтау, у складзе якіх было 45 чалавек, а сёлета удзельнічала ужо 7 факультэтау, выставіушых 60 спартсменау. Колькасць зацікауленых гэтым відам спорту расце, але запрасіць іх на трэніроукі немагчыма: адсутнічае свая спецыялізаваная зала. Мне здаецца, што універсітэту дауно пара яе мець.

**О. САУНІН,**
**галоўны суддзя спаборніцтваў, выкладчык кафедры фізвыхавання і спорту.**